## № 78. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*18 сьнежня 1934 г.*

Любая Анечка і слаўныя мае коцікі–варкоцікі Лорачка і Лялячка!

Дзякую за прысланае. Дарэмна ты турбуешся, што не паслала, што думала. Я жыву добра. Здаровы. Ты глядзі сябе і дзетак. Глядзі, каб схадзіла да доктара і параілася наконт болю ў жываце. Я атрымаў мукі шэрай. Перасылаю табе. Думаў, што ўдасца самому гэтымі днямі прыехаць. Але заявы маёй яшчэ не разглядалі. Ідзе пераарганізацыя шэфаў, дык, кажуць, няма калі займацца заяваю. Дакляравалі даць адказ праз дні 3–4. Калі дазволяць, дык к наступнаму дню буду дома. Наконт працы, дык чакаю рэарганізацыі метгорта ў крайгор[т]. Радзіонаў дакляраваў пасаду на рублёў 300–350. Пагляджу, як ён стрымае сваё слова. Тое–ж дакляраваў і наш упраўляючы. Вот што, Анечка, паглядзі ты мне штаны, ды калі будзе [з] кім, перашлі. Гэтых шкода ў валёнках насіць, бо хутка абтрэплюцца. Сёньня вялікі мароз, дык я ў валёнкі абуўся. Дасюль ’шчэ хадзіў у туфлях. Ты паглядзі, ці шэрыя ці карычневыя цалейшыя, дык вольнай часінай залапі іх ды перадай, буду вельмі ўдзячны.

Лорачка і Лялячка, будзьце слаўнымі дзеткамі, слухайцеся адна аднае і глядзеце парадку ў сваіх кутках. Лялячка, сама вучыся прыбіраць за сабою, прыбіраць ложак і свой куток. Чакаю ад Вас лістоў. Цалую моцна Вас, Анечка, Лорачка і Лялячка.

Ваш тата *Адам*.

## № 79. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*18 сьнежня 1934*

Любая Анечка!

Ліст твой атрымаў, і чытаючы яго, адчуваў, нібы гэта свае ўласныя настроі прышлі да мяне. Яшчэ як заняты работай, дык час праходзіць неўзаметку. Абы–ж толькі вольная хвіліна выявілася, дык так–жа, як ты пішаш, ня ведаеш дзе сабе мейсца знайсьці. Тым часам трэба перабываць гэты час у надзеі, што хутка зноў будзем разам. Ведаеш, часам адчуваеш сябе, нібы гэта вярнуўся да вучнёўскіх гадоў і жывеш толькі тут ад вакацый, і, як вучань, чакаеш іх, каб паехаць дамоў. Вечарамі, калі не хаджу на работу, праводзім час з Антосем у гутарках ды чытаньні. Зараз падвярнуўся пад рукі Ніцшэ, вот штодзень і чытаем яго перад сном. Што да маіх службовых спраў, дык укруцілі мне пэнсіі з абяцанай да старой. І аказаўся такім сьвінтусам ніхто іншы, як глаўбух. Калі я ўчора зьвярнуўся да ўпраўляючага, дык той кажа, што мне нават не гаварылі аб дагаворанасьці наконт маёй пэнсіі, і я, кажа, вызначыў паводле тае пасады, на якую Вас прызначыў. Пасада–ж гэта — ст[аршы] бухгалтар і аплачвалася яна да мяне двумастамі рублямі. Сказаў, што праз два тыдні будзе адбывацца ўтварэньне [крайгорта], дык работнікі ім будуць патрэбны, а таму і мне знойдзецца работа на рублёў 300 ці 350. Тое–ж гаварыў і Радзіонаў, які як быццам даў згоду быць у кіраўскім крайгорце глаўбухам і дакляраваў прыехаць з Горкага праз дзён пяць ужо ў якасьці глаўбуха. Праўда, я выказаў сваё недавер’е да ўсіх гэтых абяцанак. Але ён упэўніваў, што ліха мне не жадае і ня мае ніякіх падстаў мяне ўводзіць у падман. І хоць не хацелася ўсяму гэтаму верыць, але яшчэ раз даў сябе абнадзеіць і рашыў пачакаць. Тым часам падаў я заяву, каб дазволілі мне зьезьдзіць у Слабадзкі на дзён дзесяць. Але з прычыны ўтварэньня краявых органаў НКВД мая заява яшчэ